■ Бягун вакол свету

# Глядзіце на ўсе вочы: вакол Азія

**Сям'я БЯГУН працягвае сваю кругасветную вандроўку. За гэты час яны ўжо заехалі далёка на ўсход і падзяліліся з нашым карэспандэнтам сваімі ўспамінамі пра В'етнам. Краіну з цудоўнай прыродай, але спецыфічнымі адносінамі да турыстаў...**

## СУП З САКРЭТАМ

«Мы садзімся ў старадаўні цягнік і нясёмся па рэйках, крута паварочваючы. Адчуванне, што мы ў любую хвіліну можам перакуліцца. З усіх бакоў сцены джунгляў — быццам сам Кінг-Конг зараз заскочыць на наш вагон». І гэта — В'етнам. У Ханоі нашы дзяўчаты затрымаліся толькі гадзіны на дзве і накіраваліся далей — у Халонг. Туды сям'я Бягун трапіла падчас вялікага спартыўнага фестывалю. І, вядома, сёстры вырашылі ў ім паўдзельнічаць. Разам з матуляй яны знайшлі сабе каманду — і гонка на рэгатах пачалася! Было няпроста, але адрэналіну хапіла. Пасля гонкі на гэтым пляжы заставалася яшчэ адна незавершаная справа: чарадзейныя астравы. На іх часта возяць турыстаў, але нашы дзяўчаты вырашылі туды адправіцца сваім ходам. Кацярына, Элізабет і Аліса знайшлі рыбакоў, якія пагадзіліся іх падвезці. Паглядзеўшы на мясцовы цуд свету, дзяўчаты вярнуліся і праз некаторы час накіраваліся ў Да Нанг.

І што робіць кожны вандроўнік, прыбыўшы на новае месца? Вядома, ідзе падсілкавацца. У кафэ заказалі суп з мясам. Гэта была іх вялікая памылка... Праз некалькі лыжак стала зразумела, што, хутчэй за ўсё, гэта «мяса» не так даўно яшчэ гаўкала. Нашы дзяўчаты былі вельмі стомлены цяжкай вандроўкай, таму, з жалем да невядомага дварняка, суп быў даедзены, але прыкрасць засталася.

## АДЧАЙНЫ СЁРФЕР

Мара кожнага сёрфера — злавіць самую вялікую хвалю. Элізабэт, як чалавек з вопытам у заваяванні водных вяршынь, не магла не паспрабаваць гэта зрабіць і на в'етнамскіх берагах.

— Толькі заходзіш у мора, думаеш, навошта я гэта раблю? Напэўна, я вар'ятка або чалавек вады. Хвалі былі сапраўды вялікія, я такія ніколі і не лавіла. Першая спроба дабрацца да лайн-апу (месца, адкуль трэба стартаваць) аказалася няўдалай. Плынь была вельмі моцнай, я ніколі яшчэ з такой не сутыкалася. Хвалі ішлі адна за адной без перапынку — і мяне проста знесла. Я спрабавала выйсці на бераг, але зачапілася за нацягнутую ў моры вяроўку і моцна падрапалася. У гэты момант адчувала сябе, як рыба ў сетцы. Выходжу з вады, кроў цячэ па жываце і нагах, але гэта мяне не спыніла. І другая спроба стала паспяховай. Плыць прыйшлося даволі далёка, туды, дзе ламаліся хвалі. На лайн-апе разам са мной былі тры хлопцы. І я ўжо вельмі ганарылася, што змагла сюды прабрацца і не здалася. Трэба было злавіць адну добрую хвалю, але гэта было не так проста. Калі зноў давялося ныраць, у мяне парвалася мацаванне да дошкі, і я засталася ў моры сам-насам з хвалямі. Тады сапраўды стала страшна. Толькі вынырваеш, спрабуеш аддыхацца, як зноў ідзе хваля, і трэба ныраць, не ўзяўшы досыць паветра, і ты зноў трапляеш у «пральную машыну». Потым я ўбачыла сябра Рудзі, і мы разам дабраліся да берага.

## БУДЗЬ НАПАГАТОВЕ

Пасля Да Нанга сям'я Бягун паехала ў Хашымін. Там яны сустракаліся са студэнтамі мясцовай школы англійскай мовы. Разам з імі правялі некалькі заняткаў, расказваючы пра сваю вандроўку і Беларусь. За такую працу яны атрымалі жыллё ў гэтым жа будынку. Адпачыўшы, праз некалькі дзён дзяўчаты вырашылі рухацца наперад. А ў В'етнаме гэта рабіць не так проста. Мясцовыя жыхары завышаюць турыстам цану ў некалькі разоў. Гэта як гульня: хто больш возьме грошай з белага чалавека, той і пераможца. Напрыклад, дзяржаўныя аўтобусныя касы знайсці вельмі складана. Вакол шмат агенцтваў, якія прадаюць білеты ў 2—3 разы даражэй. Спытаеш мясцовага, дзе можна купіць па адэкватнай цане, ён радасна вядзе цябе ў турыстычную касу і ганарыцца, што падмануў іншаземца з кашальком. Але, калі задацца мэтай, знайсці білет за нармальныя грошы можна, што і зрабілі нашы дзяўчаты.


Элізабэт скарала хвалі ў В'етнаме.

Мяжа стала асобным выпрабаваннем на шляху ў Камбоджу. Зрабіць візу можна было адразу на месцы хвілін за дзесяць, каб зноў жа не пераплачваць агенцтвам, гэта задаволіла дзяўчат, але не спадабалася кіроўцу аўтобуса, які нечакана кінуў Алісу, Элізабэт і Кацярыну і паехаў далей без іх. Праз дзве гадзіны хады яны зразумелі, што кіроўца і не думаў іх недзе пачакаць. Прайшлося аўтастопіць. На шчасце, яны злавілі машыну, якая давезла іх да Пнампеня. Там па нумарных знаках яны знайшлі прыпынак, дзе кінулі іх рэчы. Відавочна, прасіць прабачэння ніхто не збіраўся. Азія не дае расслабіцца ні на хвіліну.

*Пра далейшыя прыгоды нашых дзяўчат у кругасветнай вандроўцы чытайце ў наступных нумарах «Звязды».*

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

■ Але, оп!

# ТРАПІЦЬ У «НЕБЫЛІЦУ»

## Чым здзівіць сталічны цырк гэтым летам?

**У «Белдзяржцырку» пачалася дэманстрацыя новай праграмы пад назвай «Небыліца», пераважная частка нумароў якой выконваецца артыстамі з Расіі. Стваральнікі абяцаюць парадаваць гледачоў разнастайнымі жанрамі, відовішчнымі трукамі, незвычайнай дрэсурай і добрым гумарам. Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на генеральнай рэпетыцыі праграмы, каб даведацца, чым сёлета будуць здзіўляць дарослых і маленькіх гледачоў.**

Па задуме аўтараў галоўны герой пастаноўкі — вечна заняты работай ва ўласнай фірме мужчына — набывае дом у мястэчку пад назвай Небыліца. Але на новым месцы сустракае незвычайнага гаспадара — гасціннага дамавіка ў выкананні заслужанага артыста Расіі Андрэя Аврушкіна. Той знаёміць яго са шматлікімі незвычайнымі мясцовымі жыхарамі, якія не толькі становяцца для героя сябрамі, але і змяняюць яго адносіны да ўласнага жыцця.

У новай праграме спалучаюцца ўсе асноўныя цыркавыя жанры: акрабатыка, эквілібрыстыка, гімнастыка, клаўнада, ілюзіянізм і дрэсіроўка. Апошняй асабліва шмат, прычым гадаванцы ў артыстаў пераважна незвычайныя. Калі прысутнасцю сабак на манежы наўрад ці кагосьці можна здзівіць, то дрэсіраваныя козы і тхары — сапраўды ўнікальнае відовішча. Галоўным нумарам праграмы самі стваральнікі лічаць выступленне дрэсіраваных буйвалаў і мядзведзяў «Самхо», прычым касалапыя тут выступаюць у ролі... наезнікаў. Фота менавіта гэтага выступлення трапіла на афішу праграмы.

— Небывальшчына — гэта род літаратуры, як правіла казкі, — расказаў **мастацкі кіраўнік «Белдзяржцырка» Вітаўтас ГРЫГАЛЮНАС.** — Ідэя праграмы прыйшла ў сувязі з тым, што нам трэба будзе працаваць на свяце «Александрыя збірае сяброў», якое праводзіцца падчас Купалля. Таму нумары падбіраліся ў адпаведнасці з гэтым. Менавіта тады мы зразумелі, што можа атрымацца асобная праграма. Зыходзілі з канкрэтных рэпрыз, якія ёсць у кожнага артыста, і спрабавалі скласці з гэтага цэльнае прадстаўленне. Безумоўна, ёсць яшчэ пэўныя хібы, якія мы бачым, але ўсё абавязкова давядзём да ладу найбліжэйшым часам.

Многія штатныя беларускія артысты цяпер знаходзяцца на гастролях у Расіі, у прыватнасці ў Краснадары і Хабараўску, іншыя рыхтуюцца да свята ў Александрыі. Менавіта таму працаваць гэтым летам у Мінску будуць расіяне. Гэта накладвае пэўны адбітак на праграму — яна заснавана пераважна на рускім фальклоры. Фальклорна-акрабатычны ансамбль «Русічы», акрабаты на арэлях пад кіраўніцтвам Алішэра Аліева, камічныя акрабаты на першах пад кіраўніцтвам Ігара Пянькова — гэтыя і многія



іншыя нумары мінская публіка зможа ўбачыць на працягу больш як месяца (праграма будзе дэманстравацца да канца чэрвеня). Пазнаёміцца з майстэрствам беларускіх цыркачоў таксама будзе магчыма — падчас праграмы выступіць, напрыклад, пара маладых паветраных гімнастаў у складзе Максіма Вінаградава і Веранікі Рыбчонак.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*





Фота Надзеі БУЖАН.

• Запрашальнік

## Сустракаем найлепшых цыркачоў свету

З 21 па 24 верасня ў «Белдзяржцырку» пры падтрымцы Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта пройдзе Першы Мінскі міжнародны фестываль цыркавога мастацтва. Мерапрыемства прымеркавана да 950-гадовага юбілею сталіцы і стане адной з самых знакавых яго падзей. У фестывальнай праграме прымуць удзел як сусветна вядомыя зоркі цырка, так і таленавітыя артысты-пачаткоўцы. Мінчане і госці сталіцы атрымаюць магчымасць пазнаёміцца з найлепшымі дасягненнямі цыркавога мастацтва з усяго свету.

— На сённяшні момант на ўдзел у конкурсе ўжо прыйшло 170 заявак, — адзначыў **дырэктар «Белдзяржцырка» Уладзімір ШАБАН.** — Нам трэба будзе адабраць з іх 25. Геаграфія надзвычай шырокая, пачынаючы ад Аўстраліі і заканчваючы Лацінскай Амерыкай. Мяркую, што на форуме будуць прадстаўлены ўсе кантыненты. Кожны фестываль ганарыцца сваім складам журы, у нас свой удзел ужо пацвердзілі прадстаўнікі Іспаніі, Францыі, Аўстраліі, Украіны, Венгрыі, Расіі, Германіі. Нашы кіраўнікі зробяць з нумароў унікальную праграму, таму, спадзяюся, глядач застанецца задаволеным. Акрамя таго, мы хочам заявіць пра сябе як пра структуру, здольную арганізаваць фестываль такога маштабу. Цяпер чакаем толькі зацвярджэння з боку Мінгарвыканкама, арганізацыйны камітэт і палажэнне ўжо створаны. Будзем імкнуцца, каб мерапрыемства стала вянцом святкавання 950-годдзя сталіцы.

Па выніках конкурснай праграмы будзе прысуджаны Гранпры, па два залатыя, сярэбраныя і бронзавыя медалі, прыз глядацкіх сімпатый і спецыяльныя прыз мэра Мінска. А найлепшыя нумары фестывалю будуць прадстаўлены ўжо ў асенняй праграме «Белдзяржцырка».